**Мінскі міжнародны кінафестываль “Лістапад”**

Мінскі міжнародны кінафестываль “Лістапад” – найбуйнейшы кінафорум, на які кожны год збіраюцца вядомыя рэжысёры, акцёры, аматары кінамастацтва. Мерапрыемства праводзіцца ў лістападзе па рашэнні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Арганізатарамі з’яўляюцца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная кінастудыя “Беларусьфільм”, Беларускі саюз кінематаграфістаў. Створаны арганізацыйны камітэт фестывалю ў складзе прадстаўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання, зацікаўленых арганізацый, грамадскіх аб’яднанняў. Задачамі фестывалю з’яўляюцца развіццё і ўмацаванне міжнародных культурных сувязей, паказ дасягненняў нацыянальнага кінамастацтва краін СНД і іншых дзяржаў, устанаўленне творчых кантактаў і абмен вопытам у галіне кіно, тэлебачання, далучэнне гледача да лепшых узораў сусветнага кінематографа. У рамках мерапрыемства праводзіцца конкурс фільмаў, якія ацэньвае міжнароднае журы кінематаграфістаў. У яго ўваходзяць вядомыя дзеячы айчыннага і замежнага кінематографа, журы кінапрэсы ў складзе кінакрытыкаў, журналістаў, іншых прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, журы гледачоў. На кінафестывалі ў Мінску можна ўбачыць толькі лепшае кіно – фільмы-ўдзельнікі і прызёры самых прэстыжных кінафестываляў свету. У конкурсе маладога кіно прадстаўлены дэбютныя работы аўтараў, якія ўжо заваявалі прызнанне прафесіяналаў і гледачоў. Міжнароднае журы кінематаграфістаў вызначае пераможцаў і ўручае самыя ганаровыя ўзнагароды фестывалю – гран-пры “Золата Лістапада” (намінацыя “За лепшы фільм”), “Серабро Лістапада” (намінацыя “Фільм як з’ява мастацтва”, прысуджае Міжнароднае журы кінапрэсы), “Бронза Лістапада” (прыз сімпатый гледачоў за лепшы ігравы фільм). Таксама яно прымае рашэнне аб узнагароджанні ўдзельнікаў фестывалю па наступных намінацыях: “За лепшую рэжысёрскую работу”, “За лепшае выкананне мужчынскай ролі”, “За лепшае выкананне жаночай ролі”, “За лепшую аператарскую работу імя заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь, кінааператара, кінарэжысёра Юрыя Марухіна”, “За лепшы дэбют у кіно імя народнага артыста СССР, кінарэжысёра Віктара Турава”. Акрамя гэтага, міжнароднае журы мае права пры неабходнасці заснаваць іншыя намінацыі. Журы кінапрэсы прымае рашэнне аб узнагароджанні ўдзельнікаў фестывалю па асобных намінацыях. Органы дзяржаўнага кіравання, іншыя юрыдычныя і фізічныя асобы па ўзгадненні з аргкамітэтам могуць засноўваць спецыяльныя прызы для ўзнагароджання фільмаў і мерапрыемстваў фестывалю. Прэстыжныя ўзнагароды ўручаюцца ў конкурсах дакументальнага кіно, фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі “Лістападзік”. Заснаваны таксама прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі “За гуманізм і духоўнасць у кіно”.

Першапачаткова “Лістапад” прадугледжваўся як кінафорум краін СНД і Балтыі. Адбіраліся, як правіла, карціны, якія па тых або іншых прычынах не траплялі ў шырокі пракат, але ілюстравалі культуру той ці іншай краіны. Менавіта ў такой якасці мерапрыемства ўпершыню паўстала перад грамадскасцю ў лістападзе 1994 г. Да 2002 г. называлася Міжнародным кінафестывалем краін СНД і краін Балтыі. З цягам часу кінафестываль пашыраўся, заваёўваў аўтарытэт. У 2001 г. упершыню ўрачыстае адкрыццё “Лістапада” прайшло на галоўнай канцэртнай пляцоўцы краіны – у Палацы Рэспублікі, што пасля стала добрай традыцыяй. У 2010 г. фестываль паўстаў перад гледачамі ў абноўленым фармаце. Яго праграму склалі асноўны конкурс ігравога кіно (12 фільмаў), конкурс маладога кіно (9 дэбютных фільмаў рэжысёраў з усяго свету, у тым ліку ўпершыню з Індыі, Перу, Венесуэлы, Іспаніі, Уругвая), конкурсны паказ неігравых фільмаў (20 карцін), конкурс маладога неігравога кіно (12 карцін). Адметнай асаблівасцю XVII Мінскага міжнароднага кінафестывалю “Лістапад” з’ўлялася тое, што яго пераможца вызначыла прафесійнае журы, а не гледачы, як гэта было ў папярэднія гады. Арганізатары

мерапрыемства аргументавалі новаўвядзенне тым, што гледачы не могуць паглядзець усе конкурсныя фільмы, у лепшым выпадку яны пазнаёмяцца з 30% кінастужак, а гэта ўжо неаб'ектыўна. У 2011 г. кінафестываль упершыню прайшоў у новым статусе. Міжнародная федэрацыя асацыяцый кінапрадзюсараў (FIAPF) прадставіла "Лістападу" часовае акрэдытаванне FIAPF. Гэты статус дасць магчымасць па заканчэнні двух гадоў выпрабавальнага тэрміну ўстаць у адзін шэраг з найбольш прэстыжнымі сусветнымі кінафорумамі, сярод якіх – Берлінскі, Канскі, Венецыянскі, Сан-Себасцьянскі фестывалі. Праграма Мінскага міжнароднага кінафестывалю "Лістапад" багатая і ўнікальная. Секцыі ігравога і дакументальнага кіно прадстаўляюцца ў рамках асноўнага конкурсу і конкурсу маладога кіно, праходзіць конкурс дзіцячага і юнацкага кіно "Лістападзік". Таксама на кінафестывалі праводзяцца пазаконкурсныя і рэтраспектыўныя паказы, сустрэчы, майстар-класы, выставы і вернісажы.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2013 г.